*В.У.Сашчэка*

# ТАЛЕРАНТНАСЦЬ ЯК КАМПАНЕНТ МІЖЭТНІЧНЫХ АДНОСІН

Сучаснае чалавецтва – гэта мноства розных супольнасцей, што склаліся гістарычна. Сярод іх асаблівае месца займаюць утварэнні, якія прынята называць этнічнымі: нацыі, народнасці, плямёны, групы. Такіх супольнасцей сёння налічваецца каля некалькіх тысяч. Як чалавек не можа існаваць без узаемаадносін з іншымі людзьмі, так этнічная супольнасць не здольная існаваць у ізаляцыі ад іншых. Этнакультуролагі і этнолагі разумеюць міжэтнічныя адносіны ў шырокім сэнсе як узаемадзеянне народаў у розных сферах грамадскага жыцця (палітыцы, мастацтве, навуцы і інш.), а ў вузкім – як міжасобасныя адносіны людзей рознай этнічнай прыналежнасці, якія таксама адбываюцца ў розных сферах зносін (працоўнай, сямейна-бытавой і нефармальных відах узаемадзеяння).

Спецыфіка міжэтнічных адносін у тым, што яны ахопліваюць усе сферы грамадскага жыцця: эканамічную, сацыяльную, палітычную, культурна-псіхалагічную і інш. Практычна кожны этнас у той ці іншай ступені адкрыты для кантактаў і ўспрымання культурных дасягненняў іншых этнасаў і адначасова гатовы падзяліцца сваімі культурнымі дасягненнямі і каштоўнасцямі. Аднак міжэтнічныя адносіны не заўсёды маюць пазітыўны характар. Неаднароднасць працякання сацыяльна-эканамічных, этнічных і дэмаграфічных працэсаў прывяла да велізарных адрозненняў паміж этнасамі ва ўзроўнях развіцця, умовах жыцця і колькасці насельніцтва, што выклікае міжэтнічныя сутыкненні, войны, напружанасць і інш.

Важна адзначыць, што сёння ў выніку змяшання рас і народаў чыстыя этнічныя тыпы амаль не захаваліся (выключэнне ўяўляюць "замкнутыя" грамадствы, напрыклад аўстралійскія абарыгены), акрамя таго, каля 30% насельніцтва планеты належыць да змяшаных і прамежкавых у расавых адносінах груп [4, с.104]. Сучасны чалавек жыве ў поліэтнічным асяроддзі і павінен умець адаптавацца да скла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даных і дынамічных сацыякультурных абставін. Характар і змест міжэтнічных узаемаадносін у многім залежыць ад здольнасці іх удзельнікаў разумець адзін аднаго і дасягаць згоды; гэта здольнасць вызначаецца ў асноўным этнічнай культурай кожнага з удзельнікаў кантакту, псіхалогіяй этнасаў-кантакцёраў. Такім чынам, рашаючым у міжэтнічных адносінах становіцца такі сацыяльна-псіхалагічны феномен, як талерантнасць.

Паводле азначэння Г.Т.Тавадава, нацыянальная талерантнасць – "спецыфічная рыса нацыянальнага характару, духу народа, якая з'яўляецца неад'емным элементам структуры менталітэту і арыентуецца на цярпімасць, адсутнасць ці аслабленне рэакцыі на які-небудзь неспрыяльны фактар у міжнацыянальных адносінах" [5, с.345]. Талерантнасць прадугледжвае не толькі існаванне, але і трывалае ўкараненне ў чалавечую супольнасць шэрага ўстановак для разумення міжэтнічных адносін. У першую чаргу гэта ўстаноўка на незалежнасць, аўтаномнасць этнасу, недапушчальнасць сілавога навязвання якіх-небудзь этнічных нормаў і стэрэатыпаў. Сёння ў сітуацыі глабальнай узаемазалежнасці і цесных міжэтнічных кантактаў талерантнасць у большай ступені, чым калі-небудзь, – цалкам практычная ўмова выжывання. У сучасным свеце, улічваючы ўзровень і колькасць зброі, без выпрацоўкі ўзаемнай цярпімасці цывілізацыі, культуры, у выніку сутыкнення нацыі могуць знішчыць адна адну.

На першы погляд паняцце "талерантнасць" даволі адназначнае. Аднак яно складаней, чым здаецца. Цярпімасць праяўляецца ва ўчынках, але фарміруецца ў сферы свядомасці. Можна вылучыць тры псіхалагічныя ўзроўні талерантнасці: сітуатыўна-камунікатыўны (стаўленне асобы да канкрэтнага чалавека іншай этнічнай прыналежнасці), тыпалагічна камунікатыўны (стаўленне чалавека да прадстаўнікоў іншай нацыі), агульнакамунікатыўны (стаўленне да нацый увогуле, якое абумоўлена культурнымі ўстаноўкамі і стэрэатыпамі). Агульнакамунікатыўная талерантнасць у значнай ступені прадвызначае сітуатыўную і тыпалагічную формы, з'яўляецца для іх падмуркам.

Праблема ўкаранення талерантнага мыслення ў грамадстве заключаецца ў тым, што, нават згаджаючыся з такой не-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абходнасцю, можна па-рознаму падыходзіць да тлумачэння гэтага паняцця. Пад талерантнасцю неабходна разумець не індыферэнтнасць у міжэтнічных зносінах, а згоду на ўзаемную цярпімасць і прыняцце іншых такімі, якія яны ёсць, і, галоўнае, гатоўнасць узаемадзейнічаць з імі. В.Лякторскі вылучае чатыры магчымыя спосабы тлумачэння талерантнасці, чатыры яе віды.

Першы від – талерантнасць як абыякавасць. У гэтым выпадку ў грамадстве дапускаецца існаванне розных поглядаў, але толькі тых, якія не перашкаджаюць нармальнаму суіснаванню. Розныя этнічныя групы могуць мець свае цэрквы, школы, мову, трымацца сваіх звычаяў. Грамадства не прымае толькі тыя дзеянні, якія парушаюць яго спакой. Талерантнасць у гэтым выпадку выступае не як згода, а хутчэй як абыякавасць да існавання розных поглядаў, паколькі апошнія разглядаюцца ў якасці неістотных перад шэрагам асноўных праблем, з якімі мае справу грамадства.

Другі від – талерантнасць як немагчымасць узаемаразумення. У гэтым выпадку іншыя культуры ўспрымаюцца як прыналежныя іншаму свету, з якім не існуе ніякіх кропак сутыкнення. Пры гэтым культуры лічацца раўнаважнымі, але ў той жа час – несувымернымі і непазнавальнымі. Адзіная аб'яднальная ідэя – тая, што ўсе этнічныя групы маюць роўныя правы на існаванне і культурнае развіццё. Талерантнасць тут выступае як павага да іншага, аднак гэтага іншага зразумець немагчыма, а таму з ім нельга і ўзаемадзейнічаць.

Трэці від – талерантнасць як патуранне. У гэтым разуменні паміж рознымі культурамі ідзе пастаяннае спаборніцтва, у ходзе якога яны спрабуюць даказаць сваю самакаштоўнасць. У той жа час у разнастайнасці каштоўнасных сістэм розных культур існуе прывілейная сістэма адліку – гэта каштоўнасці "маёй" культуры, "мае" асобныя погляды ў межах гэтай культуры. Прызнаецца недапушчальнасць сілавога навязвання "маіх" каштоўнасцей "іншаму". Але тое, што прадстаўнік іншай культуры не прымае "мае" погляды, успрымаецца толькі як яго нясталасць. У гэтым выпадку цярпімасць выступае як патуранне слабасці іншых у спалучэнні з доляй пагарды да іх.

І, нарэшце, чацвёрты від талерантнасці, які В.Лякторскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыць прадуктыўным у той сітуацыі, у якой знаходзіцца сучасная цывілізацыя, – талерантнасць як пашырэнне ўласнага вопыту і крытычны дыялог. Гэтае разуменне талерантнасці грунтуецца на канцэпцыі дыялога культур М.М.Бахціна: кожная культура не толькі ўступае ў барацьбу з іншай культурай, але спрабуе ўлічыць яе вопыт, пашыраючы тым самым гарызонт свайго ўласнага вопыту. Станаўленне і развіццё этнічнай ідэнтычнасці магчыма на аснове камунікацыі з "іншым", дыялога з альтэрнатыўнымі пунктамі гледжання, пазіцыямі. Іншая культура пры такім разуменні ўспрымаецца не як канкурэнт, а хутчэй як суразмоўца, да вопыту якога можна далучыцца. Пры гэтым маецца на ўвазе не поўнае пераймание, а выбіральнасць у адносінах да гэтага вопыту, калі культуры "не сливаются и не смешиваются, но взаимно обогащаются" [1, с. 334]. Талерантнасць у гэтым выпадку выступае як павага да іншай пазіцыі ў спалучэнні з устаноўкай на ўзаемнае змяненне пазіцый у выніку крытычнага дыялога.

Ацэньваючы сучасную культурную сітуацыю, можна сказаць, што свет стаіць перад дылемай: або сутыкненне розных цывілізацый (аж да ўзброенай барацьбы паміж імі), або наладжванне дыялогу, спроб узаемаразумення, узаемнай крытыкі, самакрытыкі і ўзаемазмянення. Праблему талерантнасці можна аднесці да глабальных праблем сучаснасці. Сёння, з аднаго боку, лёгка паказаць, што нецярпімасць у свеце не памяншаецца, а расце, з другога боку, зразумела, што без культывавання талерантнасці ўзаемнае знішчэнне розных цывілізацый, культур, сацыяльных і этнічных груп больш чым верагодна. Пазбегнуць канфрантацыі, магчымасць якой рэальная, можна толькі на шляху кампрамісаў і дамоўленасцей, самаўдасканалення і сумеснага рашэння тых цяжкасцей, з якімі сутыкнулася ў сваім развіцці сучасная цывілізацыя.

1. *Бахтин М.М.* Эстетика словесного творчества. – М.: Искусство, 1979.

2. *Библер В.С.* Михаил Михайлович Бахтин, или Поэтика культуры. – М.: Прогресс, 1991.

3. *Лекторский В.А.* О толерантности, плюрализме и критицизме // Вопросы философии. – 1997. – № 11. – С. 46–55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Сикевич З.В.* Социология и психология национальных отношений: Учеб. пособие. – СПб.: Изд-во В.А.Михайлова, 1999.
5. *Тавадов Г.Т.* Этнология: Учебник. – М.: Проект, 2002.

*А.У.Свечнікава*

## ВАЙНА З ЦЕНЕМ

Стваральнік аналітычнай псіхалогіі, філосаф і культуролаг К.Г.Юнг лічыў, што ўсё існае ў аснове сваёй адзінае. Але і асобны чалавек, і грамадства адчуваюць уплыў унутраных супярэчнасцей. Тое, што можа і павінна быць гарманічным, у рэчаіснасці сапсавана дысгармоніяй.

Як пісаў Т.Гобс, інстынктыўна, дзеля самазахавання, чалавек ахоўвае сваю свабоду і ў той жа час дабіваецца панавання над іншымі людзьмі. Дзяржава ў дачыненні да іншых дзяржаў паводзіць сябе так, як і асобны індывід. Сапраўды, усякая ўпарадкаваная сістэма нясе ў сабе пачатак распаду і хаосу. К.Г.Юнг згадваў пра закон энантыядроміі, паводле якога ўсё перацякае ў сваю супрацьлегласць. Так, рацыянальная культурная ўстаноўка абарочваецца ў ірацыянальнае культурнае апусташэнне; усе хочуць міру, але садзейнічаюць вайне.

Найноўшая гісторыя – “набор” супрацьстаянняў: Усходу і Захаду, капіталістычнай і сацыялістычнай сістэм і інш. Нельга не ўлічваць таксама глыбінныя супярэчнасці рацыянальнага і ірацыянальнага ў чалавечай душы і ў соцыуме.

Паспрабуем прымяніць канцэпцыю прыроджаных эмацыянальна-інтэлектуальных патэрнаў паводзін (архетыпаў) для аналізу соцыуму і палітычных канфліктаў.

Гісторыя чалавецтва – гэта гісторыя войнаў. “Вечным рухавіком” бунтаў, войнаў, рэвалюцый, паводле К.Г.Юнга, з’яўляецца архетып ценю. Адносна асобы гэтая дамінанта калектыўнага несвядомага азначае “негатыў”, менавіта скрытыя, нявыгадныя ўласцівасці, недастаткова развітыя функцыі і змест асабістага несвядомага, усё тое, што свядомасць ста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ